Нацыянальная платформа
Форум грамадзянскай супольнасці
Усходняга партнёрства

03.03.2014

**Зварот Беларускай нацыянальнай платформы Форуму грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства**

**« Аб ваеннай інтэрвенцыі Расіі ў незалежную Ўкраіну»**

*Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь*

*Прэзідэнту Расійскай Федэрацыі*

*Прэзідэнту ЗША*

*Еўрапейскаму Савету*

*Савету міністраў краін ЕС*

Мы, грамадзяне і прадстаўнікі арганізацый грамадзянскай супольнасці Рэспублікі Беларусь, асуджаем ваенную інтэрвенцыю Расіі ў незалежную Ўкраіну, якая суправаджаецца ўводам расійскіх вайсковых фармаванняў на тэрыторыю Крыма і ўзброеным захопам расійскімі ваеннымі, што ўжо знаходзяцца там, стратэгічна важных аб'ектаў і камунікацый, а таксама блакаваннем імі ўкраінскіх ваенных баз.

Для гэтай інтэрвенцыі Уладзімір Пуцін 1 сакавіка 2014 года атрымаў дазвол ад Савета Федэрацыі Расійскай Федэрацыі выкарыстоўваць ваенны кантынгент ва Ўкраіне. Напярэдадні, у дзеяннях захопніцкага характару ў адносінах да Ўкраіны, з боку Расіі ўжо былі выкарыстаныя расійскія вайсковыя фармаванні, якія знаходзяцца ў Крыме на аснове Харкаўскага пагаднення аб базаванні Чарнаморскага Флота Расіі ў Крыме, падпісанага Дзмітрыем Мядзведзевым і Віктарам Януковічам у 2010 годзе.

Расійскай Федэрацыяй у дачыненні да Украіны парушаныя асноўныя і агульнапрызнаныя прынцыпы і нормы міжнароднага права, што дае падставы Ўкраіне для рэалізацыі неад'емнага права на індывідуальную і калектыўную самаабарону, замацаванага ў арт.51 статута ААН. Ваенная інтэрвенцыя ў Крыме парушае абавязацельствы Расіі па міжнародных дамовах, у тым ліку , па Будапешцкім мемарандуме аб гарантыях бяспекі ў сувязі з далучэннем Рэспублікі Беларусь да Дамовы аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі, а таксама па Мемарандуме аб падтрыманні міру і стабільнасці ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Мы заклікаем Расійскую Федэрацыю неадкладна спыніць ваенную інтэрвенцыю, у тым ліку, дзеянні па блакадзе і раззбраенні ўкраінскіх вайсковых фармаваньняў, захопе і ўтрыманню стратэгічна важных аб'ектаў. Мы патрабуем спынення ўмяшання Расіі ў справы незалежнай дзяржавы Украіны!

Мы заклікаем кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь не прымаць рашэнні па ўдзеле беларускіх вайскоўцаў у дзеяннях Расійскай Федэрацыі ва Ўкраіне, і нагадваем, што падобныя дзеянні не прадугледжаны дамовай па АДКБ.

Мы заклікаем падпісантаў Будапешцкага мемарандума прыняць неадкладныя меры па выкананні сваіх абавязацельстваў па абароне суверэнітэту і цэласнасці Ўкраіны. У сувязі з гэтым мы выступаем таксама за неадкладныя дзеянні сусветнай супольнасці, накіраваныя на ўрэгуляванне ваеннага супрацьстаяння Расіі і Ўкраіны, якая пагражае перарасці ў кровапралітную вайну. У першую чаргу, такімі нам бачацца дзеянні мірнага характару па палітычнаму ціску на Расію з мэтай яе адмовы ад ваеннай інтэрвенцыі ва Ўкраіну. Мы прапануем прыняць рашэнні аб прыпыненні сяброўства Расеі ў G8, G20 і СГА, спыніць імпарт у Расію тэхналогій падвойнага прызначэння, якія могуць быць выкарыстаны ў ваенных дзеяннях, замарозіць актывы расійскіх афіцыйных асоб, адказных за ваенную інтэрвенцыю ва Ўкраіну, а таксама актывы кампаній, якія вырабляюць прадукцыю ваеннага прызначэння, у краінах ЕС і ЗША. Прапануем таксама ў сувязі з ваеннай інтэрвенцыяй Расіі разгледзець пытанне аб пазбаўленні Расіі права правядзення чэмпіянату свету па футболе 2018 г.

Мы лічым , што сёння найбольш важным з'яўляецца недапушчэнне маштабнага ўзброенага канфлікту Расіі і Ўкраіны. Гэты канфлікт можа прывесці да масавых ахвяраў, у тым ліку, сярод мірнага насельніцтва, куды могуць патрапіць і этнічна рускія, чые правы нібыта абараняе Расія. Вынікам ваенных дзеянняў у Крыме і Ўкраіне могуць стаць цяжкапераадольныя ў бліжэйшай перспектыве экалагічныя наступствы, ператварэнне цяперашніх курортаў, прыродных комплексаў і сельскагаспадарчых зямель у тэрыторыі, непрыдатныя для жыцця.

Мы заклікаем усе бакі не дапусціць новай вайны, новай гуманітарнай, міжнацыянальнай, эканамічнай і экалагічнай катастрофы!

Мы звяртаемся да нашых калег з іншых краін у рамках Форуму грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства выказаць агульнае стаўленне грамадзянскай супольнасці краін Усходняга партнёрства да гэтай сітуацыі.

*Беларускія арганізацыі грамадзянскай супольнасці, удзельнікі Беларускай нацыянальнай платформы Форуму грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства (больш за 60 арганізацый)*